# У космас— без ракеты

«Безракетная індустрыялізацыя космасу: праблемы, ідэі, праекты»—так называлася першая навукова-тэхнічная канферэнцыя, якая праходзіла ў Гомелі. У ёй прынялі ўдзел лётчыкі-касманаўты СССР І. П. Волк і Ю. В. Малышаў, больш ста буйных вучоных з 20 гарадоў краіны, канструктараў, інжынераў, сацыёлагаў, філосафаў, экспертаў па пытаннях міжнародных адносін і ваенна-палітычнай праблематыкі, якія працуюць над вырашэннем глабальных праблем сучаснасці касмічнымі сродкамі, перспектывамі індустрыялізацыі мірнага асваення космасу, як альтэрнатывы яго мілітарызацыі, прынцыпамі стварэння, тэорыі і разліку неракетных геатэхнічных і транспартных сістэм, арганізацыяй шырокамаштабных грузапатокаў на трасе «Зямля — арбіта—Зямля» і г. д.

Прадметам асаблівай увагі ўдзельнікаў канферэнцыі былі нетрадыцыйныя тэхнічныя ідэі і рашэнні, накіраваныя на стварэнне незвычайнага касмічнага транспарту: касмічных ліфтоў, сонечных парусрікаў, электрамагнітных паскаральнікаў, мікрагазітрона, агульнапланетнага транспартнага сродку (АТС). Найбольш актыўна праходзіла абмеркаванне праекта АТС, аўтарам якога з'яўляецца гамяльчанін, загадчык патэнтна - ліцэнзійнай службы Інстытута механікі металапалімерных сістэм АН БССР А. Э. Юніцкі. Дзякуючы яго распрацоўкам горад над Сожам і стаў месцам правядзення канферэнцыі.

Было падкрэслена, што ў праекце А. Э. Юніцкага закладзена рэвалюцыйная ідэя ў тэхніцы, якая можа даць чалавецтву новы імпульс прагрэсу, аб'яднаць яго намаганні ў мірным асваенні космасу. Рэалізацыя праекта запатрабуе вялікіх намаганняў вучоных, інжынераў, спецыялістаў іншых галін многіх краін. А цяпер работы па яго ажыццяўленню знаходзяцца ў пачатковай стадыі, і таму першым крокам у гэтым напрамку з'явілася рашэнне канферэнцыі лічыць мэтазгодным стварыць Усесаюзны савет па праблемах безракетнай індустрыялізацыі космасу, звярнуцца ў дырэктыўныя органы, АН СССР і АН БССР з хадайніцтвам аб уключэнні гэтых работ у план навукова-тэхнічных праграм акадэмій з наданнем ім статусу важнейшых дзяржаўных задач, аб стварэнні ў Гомелі гасразліковай навуковай арганізацыі з поўным штатам і юрыдычнымі правамі.

**У. ПЕРНІКАЎ.**